**“Бібліятэка Храптовічаў” (2008–2009 гг.)**

Беларуска-ўкраінскі праект па захаванні, бібліяграфічнай рэканструкцыі і сумесным выкарыстанні кнігазбору Храптовічаў рэалізаваны Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Украіны імя У.І. Вярнадскага пры падтрымцы ЮНЕСКА. Бібліятэка роду Храптовічаў збіралася на працягу другой паловы XVIII – XIX стст. у радавым маёнтку Шчорсы на Наваградчыне. Яна была заснавана Яўхімам Храптовічам (1729–1812), апошнім канцлерам Вялікага Княства Літоўскага і вядомым бібліяфілам, а пасля папаўнялася яго нашчадкамі. Найбольш значная захаваная частка гэтага гістарычнага кнігазбору (каля за 2000 экз.) у цяперашні час захоўваецца ў Кіеве ў Нацыянальнай бібліятэцы Украіны імя У.І. Вярнадскага. Мэта навуковага праекта – забеспячэнне эфектыўнага доступу да калекцыі Храптовічаў шляхам стварэння бібліяграфічных і паўнатэкставых баз даных, выпуску тыражаваных электронных выданняў і праз Інтэрнэт. У выніку праведзенага даследавання ў 2009 г. было выпушчана электроннае выданне “Бібліятэка Храптовічаў”, якое змяшчае матэрыялы па гісторыі бібліятэкі Храптовічаў, апісанне калекцыі і паўнатэкставыя электронныя копіі найбольш каштоўных выданняў.